Гардзееў Б.

# "ВАЯВАЎ, ЯК І ЎСЕ..."

**Яфім Ізрайлевіч Злацін нарадзіўся ў 1913 годзе ў Магілёве ў сям'і рабочага. Скончыўшы рабфак, працаваў у гархарчпрамгандлі. Служыў у Чырвонай Арміі ў 1935-37 гадах. На другі дзень Вялікай Айчыннай вайны пайшоў на фронт. Мінамётчык. Затым палітработнік.**

Напярэдадні 20-годдзя Перамогі савецкага народа над фашысцкай Германіяй Яфіма Ізрайлевіча запрасілі да сябе камсамольцы адной з маскоўскіх школ. Ён быў ужо сур'ёзна хворы: давалі аб сабе ведаць раненні і кантузія, атрыманыя на фронце. Жонка раіла яму папрасіць прабачэння ў вучняў і не хадзіць на гэту сустрэчу.

– Там расхвалюешся і табе стане горш. Ведаю я цябе, – гаварыла яна мужу.

Але Яфім Ізрайлевіч ужо не чуў слоў жонкі: у думках "праварочваў" ход свайго расказа аб баявым шляху слаўнай 78-й гвардзейскай стралковай дывізіі і, стаўшага родным, 225-га гвардзейскага стралковага палка, сваіх баявых сяброў, з якімі плячо ў плячо змагаўся пад Варонежам, гнаў акупантаў з зямлі Украіны, фарсіраваў не адзін водны рубеж...

Ужо ў канцы сустрэчы вучань-старшакласнік задаў пытанне:

– За якія подзвігі вам прысвоілі званне Героя?

Яфім Ізрайлевіч некалькі разгубіўся. Паціснуў плячамі, задумаўся.

– Я ж вам дзве гадзіны расказваў аб подзвігах, – сабраўшыся, нарэшце, з думкамі, адказаў Я. І. Злацін.

– Вы ж гаварылі аб усіх, – упарта стаяў на сваім камсамолёц. – Аб сабе не сказалі ні слова. Што ж, вы, ваявалі, як і ўсе...

– Правільна, ваяваў, як і ўсе...

Праўда, за які ж канкрэтны, подзвіг сяржанту. Я. І. Злаціну 26 кастрычніка 1943 года было прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза?

Зазірнём у яго наградны ліст або, карацей кажучы, у хадайніцтва, камандавання 78-й гвардзейскай стралковай дывізіі перад штабамі 7-й гвардзейскай арміі і Стэпавага фронту.

...У верасні 1943 года падраздзяленні 225-га гвардзейскага стралковага палка ў раёне пасёлка Верхадняпроўскі, што ў Днепрапятроўскай вобласці, выйшлі да Дняпра. Роты з ходу пачалі фарсіраванне сур'ёзнага воднага рубяжа. Узвод мінамётчыка сяржанта Злаціна, заняўшы пазіцыю на востраве Глінск- Барадаеўскі, актыўна падтрымліваў агнём пехацінцаў, якія высаджваліся на крутым дняпроўскім беразе.

Поспех захопу плацдарма на правым беразе ракі ў немалой ступені быў забяспечаны мінамётчыкамі сяржанта Злаціна. У ходзе бою імі было знішчана 9 кулямётных кропак, 3 мінамётныя батарэі і каля роты салдат і афіцэраў праціўніка.

Пачаўся бой за ўтрыманне захопленага плацдарма. Па ўласнай ініцыятыве сяржант высунуў свае мінамёты ў баявыя парадкі пяхоты. Дзякуючы трапнаму, агню "самавараў", як любоўна называлі ў савецкіх войсках мінамёты, было адбіта сем жорсткіх контратак гітлераўцаў, якія не спыняліся і пасля ўступлення ў баі ўсяго саставу 225-га гвардзейскага палка...

Камандзір 3-га батальёна капітан Касаткін, па-пластунску дабраўшыся да агнявой пазіцыі мінамётчыкаў, быў здзіўлены змярцвелай бледнасцю, што разлілася па твару сяржанта Злаціна. Аказалася, што яшчэ ў пачатку баёў за ўтрыманне плацдарма Яфім Ізрайлевіч быў цяжка паранены, а ў час артпадрыхтоўкі праціўніка да трэцяй контратакі – кантужаны. І цяпер бледны, зусім глухі, заікаючыся і расцягваючы словы, камандаваў:

– Аг-г-онь!.. Аг-г-онь!..

Яфім Ізрайлевіч запомніў на ўсё жыццё добрую ўсмешку і моцны поціск рукі тады яшчэ генерала арміі І. С. Конева, які прыехаў у франтавы шпіталь, каб уручыць высокія ўзнагароды Радзімы воінам, якія вызначыліся пры фарсіраванні Дняпра. Ад Івана Сцяпанавіча ён даведаўся, што камандаванне фронту рэкамендуе яго на вучобу ў Ленінградскае ваенна-палітычнае вучылішча імя Энгельса. Вучылішча ён паспяхова закончыў у канцы 1944 года.

Нядоўга быў лейтэнант Злацін намеснікам камандзіра артдывізіёна па палітчасці. Яшчэ да закнннчэння вайны па стану здароўя ён быў звольнены з Савецкай Арміі. Жыў у Маскве. Не раз бываў у Магілёве. Радаваўся, што горад яго дзяцінства і юнацтва стаў прыгажэйшым, чым быў да вайны.

Памёр у жніўні 1965 года. Праз тры месяцы пасля памятнай сустрэчы з маскоўскімі школьнікамі.

Ветэранам вайны здаецца, што імя героя-земляка дастойна таго, каб быць увекавечаным у назве, напрыклад, аднаго з дзесяткаў Вішнёвых або Карабанаўскіх завулкаў.

**Гардзееў, Б. "Ваяваў, як і ўсе..." / Б. Гардзееў // Магілёўская праўда. — 1989. — 31 сакавіка. — С. 4.**